# Сум і радасць у адным вянку

Ці не ў кожнага часам узнікае жаданне паспавядацца. Аднак калі звычайныя людзі пра тое, што іх хвалюе, не дае спакою, выклікае самыя розныя думкі, расказваюць блізкім, знаёмым, а то і тым, каго выпадкова сустрэлі на сваім шляху, але хто гатовы ўважліва выслухаць, а калі трэба, то і паспагадаць, дык пісьменнікі, не адмаўляючы і такой магчымасці, нярэдка бяруцца за пяро. Найчасцей у выніку гэтага роздуму з'яўляюцца проста ўспаміны. Часам выносяцца на чытацкі суд дзённікавыя запісы. Калі-нікалі пішуцца дакументальна-мастацкія аповесці, пабудаваныя на аснове пражытага і перажытага. **Зоя Падліпская** пайшла іншым шляхам. Яна напісала раман-споведзь "Маналог у паўстагоддзя...". Балазе, калі адважылася паспавядацца, была не проста магчымасць, але і неабходнасць: у жыцці пачалася яе другая пяцьдзясятвярстовая паласа. У такім разе, хочаш таго ці не хочаш, ёсць жаданне азірнуцца на пройдзены шлях, шмат падсумаваць, над многім задумацца, нешта пераасэнсаваць. Дый праз гэтыя ўспаміны-згадкі пагаварыць з самым блізкім табе чалавекам. Калі ж яго, на жаль, ужо няма ў жывых, то звяртаючыся да ягоўдумках.

Такім чалавекам для З.Падліпскай, як, бадай, і для кожнага, была мама. Ёй — Ганне Канстанцінаўне Янучок (Пятровіч) — і прысвячаецца гэты "Маналог...", апублікаваны ў 7-м нумары часопіса "Полымя" за сёлетні год. Пачынаецца ж ён, як і трэба было чакаць, з "Ліста да Маці". Толькі ў Зоі Падліпскай ліст гэты асаблівы. Сваю маму помніць слаба: пайшла яна з жыцця даўно, 24 жніўня 1972 года, калі самой апавядальніцы было ўсяго сем гадоў. Неўзабаве трэба ісці "першы раз у першы клас", а тут такая жалоба. Тое, што было тады ў яе маленькай душы, пісьменніца ў "Лісце да Маці" перадае настолькі шчыра, што, калі чытаеш гэта, непрыкметна да горла падступае даўкі клубок, а вочы міжвольна становяцца вільготнымі.

Тое, што адбывалася ў першы дзень "горкага сірочага рання", прызнаецца яна, "навечна захавалася ў памяці, да самых драбніц". Яны, "драбніцы" гэтыя, такія, што праз, здавалася б, малюнак знешне і не такі някідкі адчуваеш усю трагедыю таго, што нечакана адбылося. Але адначасова і не можаш не задумвацца над тым, як усё ж шмат у жыцці несправядлівасці, якую нярэдка і вытлумачыць немагчыма. Застаецца хіба што не забываць пра гэта, а памятаючы, знаходзіць сілы, каб жыць далей. Не толькі для сябе і тых, хто по-бач з табой, але і для блізкага чалавека, якога ўжо няма.

Памяць аб маці назаўсёды захавалася ў бліках мінулага. Не забываюцца і "чырвоныя і жоўтыя вяргіні, што пышна цвілі ў нашым гародчыку *(аповед у творы адбываецца ад першай асобы.* — А.М.) і якімі такшчодра быў вы-сыпаны Ваш апошні шлях, ад роднага парога да самых могілак". Ды не толькі гэтыя вяргіні не вянуць з гадамі: "Захаваўся ў памяці і вялікі букет чырвоных вяргінь, з якім я тою ж сцяжынкаю праз тыдзень крочыла ў першы клас. І чорныя жалобныя стужачкі, уплеценыя ў мае светлыя тонкія косы. І многае іншае, што парою ўвогуле хацелася б забыць назаўсёды..."

Самыя розныя колеры, спалучаныя ў гэтым малюнку, на першы погляд несумяшчальныя. Чырвоны, жоўты, чорны, белы. Аднак гэты своеасаблівы букет вельмі дарэчы, бо ён букет памяці, букет самога жыцця, калі, здавалася б, несумяшчальнае, зліўшыся, спалучыўшыся разам, якраз спрыяе поўнаму, праўдзіваму ўзнаўленню розных бакоў жыцця. Да мамы звяртаецца З. Падліпская

ў пачатку твора. У канцы ж "Ліста..." іншы прысутнічае зварот. Ён адметны тым, што гэта зварот-просьба: "Дай толькі сілы, Божа, выкласці на паперы мой амаль у паўстагоддзя маналог". І тут зноў жа зварот да самага блізкага чалавека: "Слухайце, мама. І даруйце мне". Пра што даравацЬ, не гаворыцца. Дый прамаўляць адразу пра гэта такой неабходнасці няма. У далейшым усё стане зразумела з самога зместу твора. Напісанае сапраўды менавіта споведзь. Кранальная, даверлівая, адкрытая. У асобных выпадках нават такая, што апавядальніца нібы душу выварочвае.

"Маналог у паўстагоддзя..." складаецца з асобных раздзелаў, якія ў асобных выпадках не толькі зместам сваім, але і сэнсавай напоўненасцю набліжаюцца да навел. Найбольш гэта відаць у першых раздзелах твора, у якіх З. Падліпская вяртаецца ў гады свайго сірочага маленства. Такіх, напрыклад, як "Два клёнікі", "Падручнік па матэматыцы", "Першыя "пяцёркі", "Бабуліна малітва" і інш. Усяго толькі невялікія штрышкі, сатканыя з болю і гора. Асабліва ў навеле "Першыя "пяцёркі". А яшчэ са спадзявання, што там, у іншым свеце, дзе ўладарыць сама Вечнасць, маці многае ведае з таго, што адбываецца ў свеце гэтым, зямным. Гэта ўсё настолькі праўдзіва, што наўрад ці магчыма было б такое прыдумаць, калі б яно не адбывалася ў сапраўднасці.

Дзяўчынка вельмі ахвочая да вучобы. У яе сшытках — адны "пяцёркі". "Аднойчы прапанавала *(бабуля. —* А.М.) схадзіць да Вас, мама, расказаць пра ўсё.

— Не забудзь. Вазьмі з сабою сшытачкі. Хай мама паглядзіць.

— А яна што, убачыць? — спытала я.

— Убачыць, дзіцятка. Усё яна бачыць". Так і зрабілі. А потым пайшлі да іншых магіл. Калі ж вярнуліся да мамінай, "заўважылі дзіўную рэч: са сшытачкаў былі зняты цэлафанавыя вокладкі... Можа гэта вецер? А можа... Так хацелася верыць, што Вы ўбачылі мае першыя "пяцёркі"..."

Іншы раз ва ўспамінах перавага аддаецца публіцыстычнасці, але гэта ніколькі не шкодзіць мастацкасці. Падобнае назіраецца ў тых выпадках, калі З. Падліпская падрабязна прасочвае свой жыццёвы шлях. Расказвае пра сваю вучобу ў школе, медвучылішчы, універсітэце. Згадвае працу на розных пасадах, у тым ліку і цяперашнюю, у рэдакцыі часопіса "Роднае слова", галоўным рэдактарам якога з'яўляецца. Называецца нямала прозвішчаў, успамінаюцца людзі, якія, можна сказаць, і з біяграфіі самой апавядальніцы, паколькі з імі ў яе былі цесныя сувязі. З цеплынёй гаворыцца пра паэта, літаратуразнаўца і выкладчыка Міколу Мішчанчука, знакамітага пісьменніка Янку Сіпакова. Дый пра свайго бацьку Івана Янучка З. Падліпская пішатак падрабязна, што бачыш яго нібы жывога.

Сустракаюцца ў творы і раздзелы, у якіх празаіка З. Падліпскую ўдала дапаўняе З.Падліпская-даследчык. Гэта назіраецца, скажам, тады, калі яна расказвае пра Анастасію Слуцкую, далучаючы да лёсу гэтай легендарнай княгіні школьнікаў ("Выпускны вечар"). Такім жа шляхам ідзе, прасочваючы гісторыю роднай вёскі сваёй маці — Падліпцы, што на Случчыне, заглыбляючыся ва ўласны радавод ("Выбранцы").

Ёсць у рамане-споведзі яшчэ адна адметнасць. Паколькі З.Падліпская вядома і як аўтар некалькіх паэтычных кніг, то некаторыя раздзелы яна аздобіла вершамі. Яны вельмі дарэчы, бо надаюць аповеду яшчэ большую

прыцягальнасць, узмацняюць яго эмацыянальнае ўздзеянне. У большай ступені гэта назіраецца пры вяртанні ў гады маленства. Узяць хоць бы гэты верш, які дапаўняе на-велу "Кісель". У самой навеле апавядальніца згадвае, як бесчалавечна абыходзілася з ёю мачыха. Дзяўчынку нават адлупцавалі за тое, што без дазволу выпіла шклянку кісялю. Крыўда з гадамі не забылася. Яна вылілася ў такія паэтычныя радкі: "Як цяжка жыць, матулечка, на Свеце. // Як горка нам, тваім сіротам дзецям. // Бы тыя касачы, схіліліся пад ветрам. // Як месяц уначы, ты нам патрэбна. // Як сонейка удзень, глыток паветра. // Ты кожнаму з дзяцей // Жывой патрэбна..."

Да чытача пакуль прыйшоў толькі часопісны варыянт "Маналогу ў паўстагоддзя...". Безумоўна, калі ён выйдзе цалкам асобнай кнігай, можна будзе атрымаць аб творы больш поўнае ўяўленне. Але і так ужо відавочна, што напісанае З. Падліпскай, спалучаючы ў сабе дакументальнасць і мастацкасць, не можа не прывабіць чытача, якому блізкая літаратура, якая, прытрымліваючыся факталагічнай дакладнасці, схільная да значных мастацкіх абагульненняў. Несумненна, толькі на карысць пойдзе, калі настаўнікі пазнаёмяць з гэтым раманам-споведдзю вучняў. У ім нямала таго, што дазваляе лепш пазнаць жыццё, задумацца над яго складанасцю.

Алесь Марціновіч

Настаўніцкая газета. — 2017. — 7 верас. — С. 15.